– концертное исполнение программы на контрольных уроках, академических концертах, зачетах и экзаменах, конкурсах, творческих мероприятиях;

Контроль учебной деятельности студентов по учебной дисциплине «Дирижирование» осуществляется с помощью следующих форм диагностики:

– исполнение музыкальных произведений;

– обсуждение исполнения музыкальных произведений на занятиях;

– видеозаписи выступлений студента с последующим обсуждением;

– все формы учебного контроля: экзамены, зачеты, контрольные уроки, академические концерты, отчетные концерты;

– творческие встречи, семинары, открытые уроки, мастер-классы.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 4.7 Критерии оценки результатов учебной деятельности

| | |
|---|---|
| 10 | Безупречное исполнение программы повышенного уровня технической сложности произведений. Студент демонстрирует блестящую дирижерскую технику, нужный темп, ощущение основного музыкального образа, полное и глубокое усвоение основной и дополнительной музыкальной литературы в рамках учебной программы; способность творчески решать сложные проблемы при исполнении музыкальных произведений различных стилевых направлений; участие в концертах, фестивалях, конкурсах. |
| 9 | Программа исполнена на высоком профессиональном уровне. Студент демонстрирует прекрасную дирижерскую технику, художественный вкус, нужный темп; наличие мобилизации внимания, концентрации творческих сил, свое отношение к исполнению, интерпретации, ощущению основного музыкального образа в музыкальных произведениях различных стилевых направлений; активную самостоятельную работу и систематическое участие в концертах. |
| 8 | Программа исполнена на достаточно высоком профессиональном уровне. Студент демонстрирует свободное владение дирижерской техникой, нужный темп; свободное владение техническими средствами и штрихами в музыкальных произведениях различных стилевых направлений; активную самостоятельную работу и систематическое участие в различных концертных мероприятиях; высокий музыкально-художественный вкус исполнения. Технические погрешности незначительны. |
| 7 | Программа исполнена на хорошем профессиональном уровне. Студент демонстрирует хорошее владение музыкально дирижерской техникой, хороший уровень музыкальной культуры исполнения программы. Однако имеются технические погрешности и недочеты в передаче музыкального образа произведений. |
| 6 | Выступление среднего профессионального уровня. Техническая, художественная и эмоциональная сторона исполнения недоработаны. Неточная передача авторского текста. |
| 5 | Выступление ниже среднего профессионального уровня. Имеются значительные стилевые, а так же технические погрешности, не решены задачи раскрытия художественного образа музыкальных произведений. |
| 4 | Выступление удовлетворительного уровня. Имеется много значительных стилевых и технических погрешностей, много ошибок в авторском тексте, художественный образ музыкальных произведений не раскрыт. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

| | |
|---|---|
| 3 | Выступление посредственного уровня. Не выучен нотный текст, масса технических погрешностей, нет представления о художественном образе музыкальных произведений. |
| 2 | Выступление неудовлетворительного, весьма низкого художественного и культурного исполнительского уровня. |
| 0-1 | Отсутствие выступления. Отказ от исполнения программы. |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# 5. ВСПОМОГАТЕЛЬНЫЙ РАЗДЕЛ

## 5.1 Учебная программа

Установа адукацыі
«Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў »

**ЗАЦЬВЯРДЖАЮ**
Першы прарэктар БДУКМ
_______________А.А. Корбут
«____» _____________2016 г.
Рэгістрацыйны № ВД- 399 /вуч.

**ДЫРЫЖЫРАВАННЕ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці:*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Мінск
БДУКМ
2014

**СКЛАДАЛЬНІКІ:**
*А.А. Кудзін,* дацэнт кафедры мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны універсітэт культуры і мастацваў”

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**
*У.М. Каральчук,* дэкан факультэта народных інструментаў установы адукацыі “Беларуская дзяржаўная акадэмія музыкі”, дацэнт;
*В.А. Немцава,* старшы выкладчык кафедры народна-інструментальнай музыкі ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў”, кандыдат мастацтвазнаўства

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**
*кафедрай* мастацтва эстрады ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў” (пратакол № 9 ад 16.04.2015 г.);
*прэзідыумам* навукова-метадычнага савета ўстановы адукацыі “Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацваў” (пратакол № 1 ад 29.10.2015 г.)

Адказны за рэдакцыю: В.Б. Кудласевіч
Адказны за выпуск: А.А.Кудзін

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Вучэбная дысцыпліна «Дырыжыраванне» ўваходзіць у блок спецыяльных і агульнапрафесійных музычна-тэарэтычных дысцыплін, якія складаюць у студэнтаў веды, навыкі і ўменні, неабходныя для будучай прафесійнай дзейнасці. Якасць фарміравання дырыжорскага выканальніцкага майстэрства ўзаемазвязана з вывучэннем такіх дысцыплін, як «Тэорыя музыкі», «Аналіз музычных форм», «Гісторыя музыкі», «Інструментазнаўства і інструментоўка», «Чытанне і аналіз аркестравых партытур», «Фартэпіяна» і інш.

Асноўная *мэта* вучэбнай дысцыпліны «Дырыжыраванне» – авалоданне студэнтамі асновамі дырыжорскага выканальніцтва.

Рэалізацыя пастаўленай мэты вызначае *задачы* вучэбнай дысцыпліны:

– фарміраванне прафесійнай зацікаўленасці студэнта ў развіцці эстраднага (джазавага) аркестравага выканальніцтва;

– развіццё шырокага музычнага кругагляду студэнта, фарміраванне і выхаванне музычнага густу;

– развіццё індывідуальных дырыжорскіх і арганізацыйных здольнасцей;

– авалоданне мануальнай тэхнікай і выхаванне эмацыянальна-валявых якасцей;

– авалоданне прыёмамі і метадамі самастойнай работы над музычным тэкстам.

У выніку вывучэння вучэбнай дысцыпліны студэнты павінны *ведаць*:

– сутнасць і тэарэтычныя асновы дырыжорскага выканальніцтва;

– асноўныя этапы работы дырыжора над партытурай;

– асаблівасці мануальной дырыжорскай тэхнікі;

– прынцыпы драматургіі музычнага твора і яго формы;

*умець*:

– дырыжыраваць творы розных жанраў і стыляў;

– аналізаваць нотны тэкст з пункту гледжання музычна-тэарэтычных, мастацка-выканальніцкіх асаблівасцей;

– складаць план паэтапнай работы над творам;

– ажыццяўляць у дырыжорскай тэхніцы паказ аўфтактаў, дынамікі, тэмпу і яго змены, паўз і фермат, акцэнтаў і сінкоп, мясцовых і агульных кульмінацый;

– арганізаваць самастойныя заняткі па ўдакладненні тэхнікі дырыжыравання і вызначыць іх змест, мэту і задачу;

– паказаць штрыхі ў дырыжорскім жэсце;

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

– паказаць акцэнты і сінкопы;
– паказаць аўфтакты да розных долей;
– паказаць паўзы і ферматы;
*валодаць*:
– дырыжорскімі жэстамі;
– дырыжорскай артыкуляцыяй;
– асноўнымі схемамі дырыжыравання;
– дырыжорскай палачкай.

У адпаведнасці з вучэбным планам на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Дырыжыраванне» ўсяго адведзена 94 гадзіны, з якіх 34 гадзіны – аўдыторныя заняткі (індывідуальныя). Рэкамендаваная форма кантролю ведаў студэнтаў – экзамен.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ПРЫКЛАДНЫ ТЭМАТЫЧНЫ ПЛАН

| Тэмы | Колькасць гадзін |
|---|---|
| | аўдыторныя (індывідуальныя) заняткі |
| *Уводзіны* | 1 |
| *Тэма 1*. Мануальная тэхніка | 2 |
| *Тэма 2*. Аўфтакт. Сутнасць і прызначэнне аўфтакта | 2 |
| *Тэма 3*. Пазіцыі рук. Выкарыстанне дырыжорскай палачкі | 2 |
| *Тэма 4*. Асноўныя схемы тактавання ў дырыжыраванні | 4 |
| *Тэма 5*. Тэмп у дырыжыраванні | 4 |
| *Тэма 6*. Дынаміка ў дырыжыраванні. Прыёмы і спосабы паказу дынамікі | 4 |
| *Тэма 7*. Штрыхі ў дырыжорскім жэсце. Паняцце артыкуляцыі | 3 |
| *Тэма 8*. Спецыфіка дырыжыравання акцэнтаў і сінкоп | 3 |
| *Тэма 9*. Паўзы, цэзуры, ферматы | 3 |
| *Тэма 10*. Пераменны метр і размер. Паліметрыя і паліры́тмія | 3 |
| *Тэма 11*. Дырыжорска-выканальніцкі аналіз твора | 3 |
| **Усяго…** | **34** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

## *Уводзіны*

Сутнасць і спецыфіка вучэбнай дысцыпліны «Дырыжыраванне», яе змест. Мэты і задачы дысцыпліны. Сувязь курса з іншымі спецыяльнымі дысцыплінамі: гісторыя музычнага мастацтва, сальфеджыа, гармонія, паліфанія, аналіз музычных форм, аркестравы (эстрадны) клас, выкладанне спецыяльных дысцыплін, інструментоўка, чытанне аркестравых партытур і інш.

### *Тэма 1. Мануальная тэхніка*

Мануальная тэхніка дырыжора. Асноўныя задачы мануальнай тэхнікі. Прынцыпы пастаноўкі дырыжорскага апарату: свабода і эканомія руху, апераджальнасць, гукарух і мелас, мастацкая мэтаздольнасць. Прыёмы выкарыстання мануальнай тэхнікі: пачатак гучання музыкі, дасягненне адлюстравання тактавых схем, адпаведнасці метра і рытму, вызначэнне характару гучання музычнага твора.

### *Тэма 2. Аўфтакт. Сутнасць і прызначэнне аўфтакта*

Аўфтакт – галоўны элемент у структуры дырыжорскага жэста. Састаўныя элементы дырыжорскага жэста. Сутнасць і прызначэнне аўфтакта, яго роля ў дырыжорскім працэсе. Разнастайнасць аўфтактаў. Структура аўфтактаў. Функцыі і віды аўфтактаў. Асноўныя правілы выканання аўфтактаў да поўных і няпоўных долей такта. Работа над практыкаваннямі па ўдакладненні паказу розных відаў аўфтактаў на музычных прыкладах (клавіры, дырэкцыёны, партытуры).

### *Тэма 3. Пазіцыі рук. Выкарыстанне дырыжорскай палачкі*

Пазіцыі рук у дырыжыраванні як сродак мастацкай выразнасці. Паняцце плана, пазіцыі рук і дырыжорскага дыяпазону. Прынцыпы выбару пазіцыі рук у дырыжыраванні ў адпаведнасці з фактурай, нюансам, тэмпам, характарам выконваемага музычнага фрагмента. Класіфікацыя пазіцый рук па вертыкалі і гарызанталі. Функцыі рук дырыжора, іх каардынацыя і дыферэнцыяцыя.

Дырыжорская палачка і яе прызначэнне. Становішча дырыжорскай палачкі.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Практыкаванні на расслабленне дырыжорскага апарату (кісць, прадплечча, плечавы пояс). Практыкаванні на расслабленне рук пры ўжыванні дырыжорскай палачкі.

*Тэма 4. Асноўныя схемы тактавання ў дырыжыраванні*

Пабудова простых метрарытмічных дырыжорскіх схем (двухдольныя, трохдольныя, чатырохдольныя). Прынцыпы пабудовы складаных схем тактавання (пяцідольныя–дванаццацідольныя размеры). Прынцып падбору дырыжорскай схемы ў адпаведнасці з тэмпам і метрарытмічным выкладаннем музычнага матэрыялу.

Сутнасць прынцыпу графічнай дакладнасці дырыжорскага жэста і тэхналогія яго ўвасаблення ў дырыжорскім выканальніцтве.

Вызначэнне шляхоў пераадолення магчымых парушэнняў адпаведнай графічнасці дырыжорскага жэста ў працэсе засваення простых і складаных метрарытмічных дырыжорскіх схем.

*Тэма 5. Тэмп у дырыжыраванні*

Паняцце аб тэмпе. Віды тэмпаў. Тэрміналогія тэмпаў і яе пераклад. Метраном і яго прызначэнне. Узаемаабумоўленасць тэмпу і характару ў музыцы. Паступовае змяненне тэмпаў (accelerando, ritenuto, rallentando, rubato і інш.) і спосабы іх дырыжорскага ўвасаблення.

Паняцце «агогіка» ў дырыжорскім выканальніцтве і яго сутнасць. Тэхналогія выканання.

*Тэма 6. Дынаміка ў дырыжыраванні.*
*Прыёмы і спосабы паказу дынамікі*

Паняцце дынамікі ў дырыжыраванні. Адлюстраванне ў дырыжорскім жэсце асноўных нюансаў (forte, piano, mezzo forte, mezzo piano). Паступовае змяненне дынамікі (diminuendo, crescendo) і яе ўвасабленне ў дырыжорскім жэсце.

Раптоўнае змяненне дынамікі (subito forte, subito piano) і яе адлюстраванне ў дырыжорскім жэсце. Затрыманы аўфтакт, тэхналогія яго выканання.

*Тэма 7. Штрыхі ў дырыжорскім жэсце.*
*Паняцце артыкуляцыі*

Штрыхі (legato, staccato, non legato) у дырыжорскім жэсце. Прынцыпы падыходу да выбару дырыжорскага штрыха.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

Паняцце дырыжорскай артыкуляцыі. Інтанацыйнае, рытмічнае, дынамічнае, тэмбравае развіццё мелодыі. Адлюстраванне ў дырыжорскім жэсце асаблівасцей фразіроўкі.

*Тэма 8. Спецыфіка дырыжыравання акцэнтаў і сінкоп*

Сутнасць акцэнтаў і сінкоп у дырыжорскім выканальніцтве і спосабы іх выканання. Пункцірны, сінкапіраваны рытмы і спосабы іх адлюстравання ў дырыжорскім жэсце.

Акцэнты і сінкопы на лічбавую долю. Акцэнты і сінкопы паміж долямі. Розныя віды акцэнтаў і сінкоп у музычных творах эстраднай і джазавай музыкі («beat», «for beat», «off beat», «kick beat»). Суадносіны метрычнага пульсу і акцэнтуацыі. Работа над практыкаваннямі па ўдасканаленні паказу акцэнтаў і сінкоп.

*Тэма 9. Паўзы, цэзуры, ферматы*

Віды паўз і паўзы ў пачатку твора, звычайныя, генеральныя, цэзуры. Спосабы адлюстравання паўз у дырыжорскім жэсце.

Фермата. Віды фермат. Фермата над нотай, тактавай рысай, над паўзай. Асноўныя прыёмы зняцця фермат. Ферматы са змяненнем і без змянення дынамікі.

*Тэма 10. Пераменны метр і размер.*
*Поліметрыя і полірытмія*

Пераменны метр і размер. Прынцыпы змены дырыжорскіх схем пры наяўнасці пастаяннага і эпізадычнага пераменнага метра і размеру. Праблема поліметрыі і полірытміі пры рабоце над сучасным музычным матэрыялам. Спалучэнне розных рытмічных фігур у фактуры твора і правілы іх адлюстравання ў дырыжыраванні. Поліметрыя ў дырыжыраванні.

*Тэма 11. Дырыжорска-выканальніцкі аналіз твора*

Дырыжорска-выканальніцкі аналіз твора. Адлюстраванне ўсіх асаблівасцей твора ў дырыжорскім працэсе. Музычна-тэарэтычны аналіз твора. Раскрыццё музычнай формы, аналіз мелодыі, гармоніі, метрарытму, тэмпу, фактуры і іншых сродкаў мастацкай выразнасці.

Паняцце інтэрпрэтацыі ў дырыжорскім выканальніцкім мастацтве.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

# ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

## Літаратура

*Асноўная*

1. *Казачков, С.* Дирижерский аппарат и его постановка / С. Казачков. – М. : Музыка, 1967. – 11 с.

2. *Канн, Э.* Элементы дирижирования / Э. Канн ; пер. с англ. Д. Э. Далгота. – Л. : Музыка, 1980. – 216 с.

3. *Канерштейн, М. М.* Вопросы дирижирования : учеб. пособие для муз. вузов / М. М. Канерштейн. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Музыка, 1972. – 255 с.

4. *Малько, Н. А.* Основы техники дирижирования / Н. А. Малько. – Л. : Музыка, 1965. – 134 с.

5. *Маталаев, Л.* Основы дирижерской техники : метод. пособие / Л. Маталаев ; общ. ред. С. Скрипки. – М. : Сов. композитор, 1986. – 208 с.

6. *Мусин, И.* Техника дирижирования : практ. руководство / И. Мусин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Просветит.-изд. центр «Деан–Адиа–М», 1995. – 295 с.

7. *Ольхов, К.* Теоретические основы дирижерской техники / К. Ольхов. – 3-е изд. – СПб. : Музыка, 1990. – 200 с.

8. *Ратнер, С.* Элементарные основы дирижерской техники / С. Ратнер. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1961. – 47 с.

9. *Свечков, Д.* Основные элементы дирижерской техники : учеб. пособие / Д. Свечков ; М-во культуры РСФСР, Глав. упр. учеб. заведений и кадров. – М., 1966. – 45 с.

*Дадатковая*

1. Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых, эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі : навуч.-метад. дапам. / Беларус. ун-т культуры ; склад.: С. І. Ажыгін [і інш.]. – Мінск : БУК, 1994. – 106 с.

2. *Еремиаш, О.* Практические советы по дирижированию / О. Еремиаш ; под ред. В. С. Смирнова. – М. : Музыка, 1964. – 72 с.

3. *Ержемский, Г.* Психология дирижирования. Некоторые вопросы исполнительства и творческого взаимодействия дирижера с музыкальным коллективом / Г. Ержемский. – М. : Музыка, 1984. – 79 с.

4. *Иванов-Радкевич, А.* О воспитании дирижера / А. Иванов-Радкевич. – М. : Музыка, 1973. – 79 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

5. *Карацееў, А. Л.* Змест і практычная накіраванасць навучальна-творчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў (арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву) : вучэб.-метад. дапам. / А. Л. Карацееў. – Мінск : Мінскі ін-т культуры, 1993. – 27 с.

6. *Кондрашин, К.* О дирижерском прочтении симфоний П. И. Чайковского / К. Кондрашин. – М. : Музыка, 1977. – 383 с.

7. *Мазанік, В. У.* Айчынная музыка: станаўленне дырыжорскай адукацыі / В. У. Мазанік // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

8. *Мазанік, В. У.* Асаблівасці падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў на ФЗН у Беларускім універсітэце культуры // Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў : матэрыялы навук.-метад. канф., Мінск, 2–3 лют. 1998 г. / Беларус. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – С. 95–100.

9. *Малько, Н.* Воспоминания. Статьи. Письма / Н. Малько. – Л. : Музыка, 1972. – 383 с.

10. *Ольхов, К.* Теоретические основы дирижерской техники / К. Ольхов. – 3-е изд. – Л. : Музыка, 1990. – 200 с.

11. *Сидельников, Л.* Симфоническое исполнительство / Л. Сидельников. – М. : Сов. композитор, 1991. – 286 с.

12. *Смирнов, Б.* Дирижерско-симфоническое искусство: музыкально-эстетические и социально-психологические аспекты / Б. Смирнов. – СПб. : Композитор, 2003. – 294 с.

13. *Хайкин, Б.* Беседы о дирижерском ремесле / Б. Хайкин. – М. : Сов. композитор, 1984. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі і выкананні самастойнай работы студэнтаў

Самастойная работа студэнтаў па дысцыпліне «Дырыжыраванне» ажыццяўляецца падчас пазааўдыторных заняткаў. Для яе эфектыўнай арганізацыі студэнтам мэтазгодна вывучаць партытуру музычнага твора комплексна – на занятках па дырыжыраванні, чытанні аркестравых партытур. Пасля знаёмства з музычным матэрыялам падчас аўдыторных заняткаў з выкладчыкам студэнту прапануецца самастойна праслухаць аўдыязапісы твора, прааналізаваць выканальніцкія інтэрпрэтацыі розных дырыжораў. З мэтай актывізацыі вучэбнай дзейнасці студэнтам прапануецца праца з масівам класічнай сімфанічнай літаратуры, а таксама з творамі, створанымі з выкарыстаннем эстрадна-джазавай стылістыкі. Важнай умовай засваення трывалых ведаў студэнтамі па дысцыпліне «Дырыжыраванне» з'яўляецца суаднясенне музычнага матэрыялу з адпаведнымі навукова-тэарэтычнымі крыніцамі і аўдыявізуальнымі дакументамі.

## Пералік рэкамендаваных сродкаў дыягностыкі вынікаў вучэбнай дзейнасці студэнтаў

Кантроль вучэбнай дзейнасці студэнтаў па вучэбнай дысцыпліне «Дырыжыраванне» ажыццяўляецца з дапамогай наступных форм дыягностыкі засваення вучэбнага матэрыялу:

– індывідуальнае выкананне музычных твораў;
– абмеркаванне выканання музычнага твора на занятку;
– відэазапіс выканання музычнага твора;
– аналіз відэазапісу;
– напісанне анатацыі да выкананых твораў;
– вуснае апытанне;
– кантрольны ўрок;
– залік.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## Патрабаванні да атэстацыі

### *Кантрольны ўрок*

Студэнт павінен прадырыжыраваць на памяць пад фартэпіяна два рознахарактарныя творы, прадэманстраваць ступень засваення дырыжорскага выканальніцкага комплексу. Выкананне праграмы павінна быць эмацыянальна выразным, адпавядаць намеру кампазітара.

### *Залік*

Студэнт павінен прадырыжыраваць на памяць пад фартэпіяна два рознахарактарныя творы складанай формы – часткі твораў сімфанічнага цыкла (санатнае алегра), уверцюру, прадэманстраваць ступень засваення дырыжорскага выканальніцкага комплексу, адказаць на пытанні калёквіуму. Выкананне праграмы павінна быць эмацыянальна выразным, адпавядаць намеру кампазітара.

### *Калёквіум*

Патрабаванні да калёквіуму складаюцца з некалькіх раздзелаў, кола пытанняў якіх закранае як спецыяльныя, так і агульныя музычныя веды:

– агульная характарыстыка творчасці кампазітара і выконваемага твора;
– аналіз партытуры;
– тэарэтычныя пытанні па тэхніцы дырыжыравання.

### I раздзел

– характарыстыка творчасці кампазітара, творы якога выконвае студэнт;
– асноўныя жанры, у якіх працаваў кампазітар, буйнейшыя творы;
– агульная характарыстыка твора, які выконваецца;
– форма музычнага твора;
– танальны план, фактура, элементы аркестравай фактуры;
– вызначэнне асноўных і другарадных кульмінацый твора;
– агогіка.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

**II раздзел**

– склад аркестра;
– назвы музычных інструментаў;
– строй і дыяпазон музычных інструментаў;
– асноўныя штрыхі;
– тэрміны партытуры (тэмпы, нюансы, характар выканання);
– фактура.

**III раздзел**

– паняцце аўфтакта;
– асноўныя віды аўфтакта;
– функцыі аўфтакта;
– пазіцыі рук, функцыі правай і левай рукі;
– дырыжорскія схемы;
– дынаміка і дырыжорскі жэст;
– тэмы і дырыжорскі жэст;
– паўзы, цэзуры, ферматы;
– пераменны метр і размер;
– поліметрыя і палірытмія.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

*Вучэбнае выданне*

**ДЫРЫЖЫРАВАННЕ**

*Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі*
*па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці*
*1-17 03 01 Мастацтва эстрады (па напрамках),*
*напрамку спецыяльнасці*
*1-17 03 01-01 Мастацтва эстрады (інструментальная музыка)*

Карэктар В. Б. Кудласевіч
Тэхнічны рэдактар Л. М. Мельнік

Падпісана ў друк 2016. Фармат 60x84 $^{1}/_{16}$.
Папера офісная. Рызаграфія.
Ум. друк. арк. 0,82. Ул.-выд. арк. 0,42. Тыраж экз. Заказ .

Выдавец і паліграфічнае выкананне:
УА «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў».
Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі выдаўца, вытворцы,
распаўсюджвальніка друкаваных выданняў № 1/177 ад 12.02.2014.
ЛП № 02330/456 ад 23.01.2014.
Вул. Рабкораўская, 17, 220007, г. Мінск.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.2 УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ:

***дневная форма получения образования***

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | КСР | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|
| | усяго | інд. заняткі | | |
| Уводзіны | 4 | 2 | 2 | Кантрольны урок |
| Тэма 1. Мануальная тэхніка | 2 | 2 | | |
| Тэма 2. Аўфтакт. Сутнасць і прызначэнне аўфтакта | 2 | 2 | | |
| Тэма 3. Пазіцыі рук. Выкарыстанне дырыжорскай палачкі | 2 | 2 | | |
| Тэма 4. Асноўныя схемы тактавання ў дырыжыраванні | 4 | 2 | 2 | Кантрольны урок |
| Тэма 5. Тэмп у дырыжыраванні | 2 | 2 | | |
| Тэма 6. Дынаміка ў дырыжыраванні. Прыёмы і спосабы паказу дынамікі | 2 | 2 | | |
| Тэма 7. Штрыхі ў дырыжорскім жэсце. Паняцце артыкуляцыі | 4 | 2 | 2 | Кантрольны урок |
| Тэма 8. Спецыфіка дырыжыравання акцэнтаў і сінкоп | 6 | 4 | 2 | Кантрольны урок |
| Тэма 9. Паўзы, цэзуры, ферматы | 2 | 2 | | |
| Тэма 10. Пераменны метр і размер. Паліметрыя і паліры тмія | 2 | 2 | | |
| Тэма 11. Дырыжорска-выканальніцкі аналіз твора | 2 | 2 | | |
| **Усяго…** | **34** | **26** | **8** | **Экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.3 УЧЕБНО-МЕТОДИЧЕСКАЯ КАРТА УЧЕБНОЙ ДИСЦИПЛИНЫ:
***заочная форма получения образования***

| Раздзелы і тэмы | Колькасць аудыторных гадзін | | Форма кантролю ведаў |
|---|---|---|---|
| | усяго | інд. заняткі | |
| Уводзіны | 2 | | |
| Тэма 1. Мануальная тэхніка | 2 | | |
| Тэма 2. Аўфтакт. Сутнасць і прызначэнне аўфтакта | 4 | 1 | |
| Тэма 3. Пазіцыі рук. Выкарыстанне дырыжорскай палачкі | 2 | | |
| Тэма 4. Асноўныя схемы тактавання ў дырыжыраванні | 4 | 1 | |
| Тэма 5. Тэмп у дырыжыраванні | 2 | 1 | |
| Тэма 6. Дынаміка ў дырыжыраванні. Прыёмы і спосабы паказу дынамікі | 2 | | |
| Тэма 7. Штрыхі ў дырыжорскім жэсце. Паняцце артыкуляцыі | 4 | 1 | |
| Тэма 8. Спецыфіка дырыжыравання акцэнтаў і сінкоп | 4 | 2 | |
| Тэма 9. Паўзы, цэзуры, ферматы | 2 | | |
| Тэма 10. Пераменны метр і размер. Поліметрыя і поліррытмія | 4 | 1 | |
| Тэма 11. Дырыжорска-выканальніцкі аналіз твора | 2 | 1 | |
| **Усяго…** | **34** | **8** | **Экзамен** |

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## 5.4 Основная литература


1. Казачков, С. Дирижерский аппарат и его постановка / С. Казачков. – М. : Музыка, 1967. – 11 с.
2. Канн, Э. Элементы дирижирования / Э. Кан ; пер.с англ. Д.Э. Далгота. – Л. : Музыка, 1980. – 216 с.
3. Канерштейн М.М. Вопросы дирижирования : учеб. пособие для муз. вузов / М.М. Канерштейн. – 2-е изд., испр. и доп. – М. : Музыка, 1972. – 255 с.
4. Малько, Н.А. Основы техники дирижирования / Н.А. Малько. – Л. : Музыка, 1965. – 134 с.
5. Маталаев, Л. Основы дирижерской техники : метод. пособие / Л. Маталаев ; общ.ред. С. Скрипки. – М. : Сов. композитор, 1986. – 208 с.
6. Мусин, И. Техника дирижирования : практ. руководство / И. Мусин. – 2-е изд., доп. – СПб. : Просветит.-изд. центр «Деан–Адиа–М», 1995. – 295 с.
7. Ольхов, К. Теоретические основы дирижерской техники / К. Ольхов. – 3-е изд. –СПб. : Музыка, 1990. – 200 с.
8. Ратнер, С. Элементарные основы дирижерской техники / С. Ратнер. – Минск : Изд-во М-ва высш., сред. спец. и проф. образования БССР, 1961. – 47 с.
9. Свечков, Д. Основные элементы дирижерской техники : учеб. пособие / Д. Свечков ; М-во культуры РСФСР, Глав. упр. учеб. заведений и кадров. – М., 1966. – 45 с.


## 5.5Дополнительная литература


1. Асаблівасці дзейнасці аматарскіх духавых,эстрадных аркестраў і ансамбляў на сучасным этапе развіцця мастацкай культуры Беларусі : Навуч.-метад.дапаможнік / Беларус.ун-т культуры ; Склад.: С.І. Ажыгін і інш. – Мн. : БУК, 1994 – 106 с.
2. Еремиаш, О. Практические советы по дирижированию / О. Еремиаш ; под ред. В.С. Смирнова. – М. : Музыка, 1964. – 72 с.
3. Ержемский, Г. Психология дирижирования. Некоторые вопросы исполнительства и творческого взаимодействия дирижера с музыкальным коллективом / Г.Ержемский. – М. : Музыка, 1984. – 79 с.
4. Иванов-Радкевич, А. О воспитании дирижера /А. Иванов-Радкевич. – М. : Музыка, 1973. – 79 с.
5. Карацееў, А.Л. Змест і практычная накіраванасць навучальна-торчага працэсу ў аркестры духавых інструментаў (арганізацыйна-метадычныя, мастацка-выканальніцкія аспекты работы аматарскага і прафесійнага калектыву) : вуч.-метад. дапам. / А.Л. Карацееў. – Мінск : Мінск. ін-т культуры, 1993. – 27 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

6. Кондрашин, К. О дирижерском прочтении симфоний П.И. Чайковского / К. Кондрашин. – М. : Музыка, 1977. – 383 с.

7. Мазанік, В.У. Айчыная музыка: станаўленне дырыжорскай адукацыі / В.У. Мазанік // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

8. Мазанік, В.У. Айчыная музыка: станаўленне дырыжорскай адукацыі / В.У. Мазанік // Асновы мастацтва. – 1997. – Вып. 9. – С. 54–62.

9. Мазанік, В.У. Асаблівасці падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў на ФЗН у Беларусскім універсітэце культуры // Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў : Матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 2-3 лютага 1998 г.) / Бел. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – С. 95–100.

10. Мазанік, В.У. Асаблівасці падрыхтоўкі кіраўнікоў аркестравых калектываў на ФЗН у Беларусскім універсітэце культуры // Выкарыстанне інавацыйных тэхналогій у арганізацыі дыстанцыйнага навучання студэнтаў-завочнікаў : Матэрыялы навук.-метад. канф. (Мінск, 2-3 лютага 1998 г.) / Бел. ун-т культуры. – Мінск, 1996. – С. 95–100.

11. Малько, Н. Воспоминания. Статьи. Письма / Н. Малько. – Л. : Музыка, 1972. – 383 с.

12. Ольхов, К. Теоретические основы дирижерской техники / К. Ольхов. – 3-е изд. – Л. : Музыка, 1990. – 200 с.

13. Сидельников, Л. Симфоническое исполнительство / Л. Сидельников. – М. : Сов. композитор, 1991. – 286 с.

14. Смирнов, Б. Дирижерско-симфоническое искусство: музыкально-эстетические и социально-психологические аспекты / Б. Смирнов. – СПб. : Композитор, 2003. – 294 с.

15. Хайкин, Б. Беседы о дирижерском ремесле / Б. Хайкин. – М. : Сов. композитор, 1984. – 264 с.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ